**С.У. Крыуліна,** *старшы выкладчык,*
**Л.У. Ляховіч,** *дацэнт,*
**А.Я. Паўлава,** *старшы выкладчык*

# САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ ПА ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ: ПРАБЛЕМЫ АРГАНІЗАЦЫІ І КАНТРОЛЮ

Сістэма адукацыі заўсёды была абумоўлена сацыякультурным і эканамічным развіццём грамадства, аказвала актыўнае ўздзеянне на соцыум. Адзначанае цалкам адпавядае сучаснай сітуацыі постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства, якая выклікала шэраг праблем. З аднаго боку, фізіялагічныя і інтэлектуальныя магчымасці чалавека засталіся такімі ж, як сотні гадоў назад, не кажучы пра негатыўны ўплыў "сціскання прасторы і часу", стрэс і неспрыяльную экалогію. З другога боку, яшчэ ніколі чалавечае грамадства не адчувала такой хуткасці ўзрастання аб'ёму інфармацыі і яе змянення, асабліва калі ўзнікае неабходнасць гэтую інфармацыю знайсці, засвоіць і прымяніць. У выніку псіхічныя і разумовыя перагрузкі людзей любога ўзросту – натуральная прымета часу.

З асаблівай вастрынёй згаданыя праблемы паўстаюць у сістэме адукацыі, асабліва вышэйшай, што заканамерна прыводзіць да патрэбы інтэнсіфікацыі навучання. Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца адным з мацнейшых сродкаў у гэтым кірунку. Яна мае некалькі аспектаў.

– *Матывацыйны аспект.* Неабходна ўсведамленне, што сучасны спецыяліст вучыцца і ўдасканальваецца на працягу ўсяго жыцця. Вышэйшая навучальная ўстанова – гэта не завяршэнне адукацыі, а адзін з яе этапаў. Кампетэнтнасць, кар'ерны рост, павышэнне аплаты працы абавязкова прадугледжваюць пастаянную самаадукацыю, у адваротным выпадку спецыяліст адстане ад сучаснага ўзроўню. Уменне знайсці, засвоіць і прымяніць веды, праявіць самастойнасць мыслення ў нестандартнай сітуацыі – неабходныя якасці, якія могуць прынесці, у тым ліку і матэрыяльныя, выгады. Задача выкладчыка – сфарміраваць у студэнта такі погляд на самастойную працу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *Арыентацыйны аспект.* Перад самастойным вывучэннем тэмы ці раздзела студэнт павінен ведаць, як матэрыял самастойнай работы звязаны з тым, што ўжо дадзена ў лекцыі ці на семінары і на што звярнуць увагу. Вялікая роля ў гэтым належыць вучэбна-метадычным комплексам, аднак накіроўвае студэнта менавіта выкладчык.

– *Аперацыйны аспект.* Як правіла, сучасныя студэнты, асабліва першых курсаў, не маюць дастатковых ведаў аб тым, як, дзе і якую інфармацыю знайсці, а знайшоўшы, аформіць. Таму неабходным з'яўляецца, па-першае, дастатковае забеспячэнне студэнтаў вучэбнай літаратурай як на папяровых, так і на электронных носьбітах. Вопыт работы паказвае, што менавіта на недахоп падручнікаў і спецыяльнай літаратуры студэнты часцей за ўсё скардзяцца, і асабліва востра гэта праблема стаіць на завочным аддзяленні. Па-другое, ужо з першых курсаў патрэбна мэтанакіравана, сістэматычна вучыць студэнтаў, як пісаць і афармляць рэфераты, курсавыя работы, выступленні на канферэнцыях, рэзюмэ і інш. У рэшце рэшт ім усім давядзецца пісаць дыпломныя працы, а некаторым – магістэрскія і кандыдацкія дысертацыі, гэтыя веды неабходны для сучаснай прафесійнай дзейнасці.

– *Кантралюючы аспект.* Усе намаганні ў рэчышчы самастойнай работы не дадуць жаданага эфекту, калі не будзе абавязковага сістэматычнага кантролю. На жаль, у нашай існуючай практыцы на кантроль самастойнай работы выкладчыку адводзіцца прыкладна дзве гадзіны ў семестр, і гэта на 5–6 студэнцкіх груп. Што можна зрабіць за гэты час? Праблема тым больш вострая, што па меры навучання ад курса да курса ўдзельная вага самастойнай работы павінна павялічвацца. Будучага спецыяліста неабходна рыхтаваць да самаадукацыі ва ўмовах працы па спецыяльнасці.

Выкладзеныя вышэй пажаданні і праблемы ў поўнай ступені адносяцца і да гістарычных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства. Гэта гісторыя Беларусі (на ўсіх факультэтах і спецыяльнасцях з дзённай і завочнай формамі навучання), сусветная гісторыя (у поўным аб'ёме – на спецыяльнасці "музеязнаўства", гісторыя Найноўшага часу – на ўсіх астатніх спецыяльнасцях, сусветная гісторыя да Новага часу – на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльнасцях, звязаных з мастацтвазнаўствам). Для студэнтаў спецыялізацыі "музеязнаўства" выкладаюцца таксама тэорыя і гісторыя гістарычнай навукі і крыніцазнаўства.

Адбор матэрыялу для самастойнага вывучэння мае метадычнае і лагічнае абгрунтаванне. Так, на самастойны разгляд выносяцца тэмы па гісторыі культуры (сусветнай і Беларусі). Як правіла, гэта наратыўны матэрыял, знайсці яго для студэнта не ўяўляе цяжкасцей. Студэнту поўнасцю па сілах зрабіць хаця б агульную характарыстыку культуры пэўнай эпохі і назваць канкрэтныя стылі і творы.

На самастойную працу студэнтаў выносяцца часткова тэмы па сусветнай гісторыі, у якіх разглядаецца гісторыя нееўрапейскіх цывілізацый у Новы і Найноўшы час (Азія, Афрыка, Лацінская Амерыка), таму што ва ўмовах жорсткага ліміту часу прыярытэтным з геапалітычнага погляду для разгляду на лекцыях і семінарах з'яўляецца матэрыял па айчыннай гісторыі, а таксама буйнейшых краін Еўропы і гісторыі ЗША. На самастойную працу выносіцца і азнаямленне з краінамі Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы, развіццё якіх часткова аналізуецца ў кантэксце разгляду палітыкі буйнейшых краін на лекцыях і семінарах.

Вучэбна-метадычныя комплексы, кола пытанняў, рэкамендуемая літаратура і пытанні для самакантролю існуюць як на папяровых носьбітах, так і ў электронным выглядзе, таму студэнты заўсёды маюць да іх доступ. На лекцыях даецца арыенцір па тэмах самастойнай работы, указваюцца іх вузлавыя праблемы, спецыяльна адзначаецца, што прыведзены спіс літаратуры мае рэкамендацыйны характар, гэта значыць цалкам дапускаецца і нават вітаецца выкарыстанне і іншай, акрамя адзначанай, літаратуры, матэрыялаў перыядычнага друку, электроннай і відэаінфармацыі. Такі падыход можна толькі падтрымліваць, таму што ён дае права выбару і стымулюе самастойны пошук, адбор матэрыялу, што вельмі важна ў самастойнай працы.

Кантроль ажыццяўляецца ў адпаведнасці з існуючымі яго формамі: даклады, рэфераты, калёквіумы, абавязковае ўключэнне тэм самастойнай работы ў экзаменацыйны матэрыял. Адной з формаў кантролю з'яўляецца падрыхтоўка рэфератаў, прысвечаных персаналіям і разгляду праблем міжнародных зносін. На кафедры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прайшла апрабацыю тэставая праграма "Бакалаўр" па гісторыі Беларусі на спецыяльнасці "музеязнаўства" і дала добрыя вынікі, таму што яна дазваляе, акрамя кантролю, працаваць у рэжыме трэнінгу. Плануецца такая ж праца па сусветнай гісторыі Найноўшага часу.

Дысцыплінамі са сваёй спецыфікай з'яўляюцца тэорыя і гісторыя гістарычнай навукі і крыніцазнаўства. Спецыфіка заключаецца ў неабходнасці знаёмства студэнтаў з вялікай колькасцю першакрыніц і выданняў па гістарычнай крытыцы. Між тым існуючыя патрабаванні да вучэбных праграм і ліміты нагрузкі не даюць магчымасці даць у праграмах нават мінімума вывучаемай літаратуры. Абмежаванні на літаратуру не даюць магчымасці прадставіць яе ў патрабуемым аб'ёме, паказаць студэнту, што яна фактычна існуе. У такім разе больш чым праблематычна весці гаворку пра актывізацыю пазнавальнай дзейнасці: аналіз манаграфій, удзел у "круглых сталах" і інш. патрабуюць грунтоўнага знаёмства з літаратурай, а не толькі засваення матэрыялу з падручнікаў. Дадзеная заўвага таксама цалкам справядлівая і пры вывучэнні сусветнай і айчыннай гісторыі.

Па тэорыі і гісторыі гістарычнай навукі на самастойную работу вылучаюцца тэмы, засваенне якіх ужо падрыхтавана лекцыйным матэрыялам; гэта тэмы больш апісальнага, чым праблемнага характару, знаёмыя па сумежных дысцыплінах. Напрыклад, на самастойную работу выносяцца такія тэмы, як сацыяльная функцыя гістарычнай навукі, развіццё гістарычных ведаў на землях Русі і інш. Па крыніцазнаўстве на самастойны разгляд выносіцца гісторыя крыніцазнаўства як навукі, аналіз крыніц па новай і найноўшай гісторыі Беларусі і г. д. Формамі кантролю выступаюць, напрыклад, тэставыя заданні па знешняй крытыцы крыніц і па тэарэтычных аспектах унутранай крытыкі. Студэнты рыхтуюць рэфераты, разглядаючы асобна такія віды крыніц, як эпісталярныя, мемуарныя, перыядычны друк і г. д.

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца формай, запатрабаванай часам і сацыякультурнай сітуацыяй, таму неабходна падысці да яе арганізацыі грунтоўна, маючы на ўвазе, што ўкладзеныя сродкі і намаганні дадуць свой вынік толькі пры іх комплексным сістэматычным прымяненні [1]. Гэта праблема

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэмная, якая патрабуе карэннай пераарыенціроўкі вучэбнага працэсу на развіццё навыкаў самастойнага атрымання студэнтамі ведаў і пастаяннай самаадукацыі [2].

1. *Радькова, О. Г.* Современные формы организации самостоятельной работы студентов по курсу Новой истории стран Запада / О.Г.Радькова // Организация самостоятельной работы студентов на факультете вуза: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 16–17 ноября 2006 г. / редкол.: В.В. Сергеенкова (отв. ред.) [и др.]. – Мн.: БГУ, 2006. – С. 45–48.

2. *Сергеенкова, В.В.* Организация управляемой самостоятельной работы студентов на историческом факультете БГУ / В.В.Сергеенкова // Материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 16–17 ноября 2006 г. / редкол. В. В. Сергеенкова (отв. ред.) [и др.]. -- Мн.: БГУ, 2006. – С. 51–55.

**А.А. Кудин,** *старший преподаватель*

## ОСНОВНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ И СОДЕРЖАНИЕ ОРГАНИЗАЦИИ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ ПО ДИРИЖИРОВАНИЮ

(духовой, эстрадный оркестры)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актуальность проблемы организации самостоятельной работы студентов оркестровых специальностей (дисциплина "Дирижирование") очевидна. Если по специальностям "народное творчество" (инструментальная музыка духовая), "духовые инструменты" (духовые инструменты народные) наметилась определенная система самостоятельных занятий, то для студентов, обучающихся по специальности "искусство эстрады", – это насущная проблема. Правомерно определить те подходы, которые в значительной степени способствуют организации самостоятельной работы студентов рассматриваемых трех специальностей. В первую очередь этот процесс должен носить управляемый и регулируемый характер. Студенты должны быть максимально информированы о тех специальных изданиях, в которых рассматриваются вопросы